**Раманаў С.Л.**

# КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ АФІЦЫЙНЫХ СВЯТАЎ У ГАРАДАХ БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

Для вывучэння гісторыі афіцыйных святаў у гарадах Беларусі XIX – пачатку XX ст. асаблівае значэнне маюць першакрыніцы. Арыгінальных архіўных матэрыялаў, датычных да працэсаў узнікненя і развіцця афіцыйнай святочнай культуры у архівах Беларусі захавалася адносна няшмат. Такая сітуацыя вынікае з таго што большасць афіцыйных святкаванняў была запланавана не на мясцовым губернскім узроўні, а прыходзіла са сталіцы імперыі ў форме гатовага плана, цыркуляра, загада, распараджэння, указа і інш., у якія часам дазвалялася ўносіць дапаўнені ў залежнасці ад спецыфікі рэгіёна і значэння для яго кожнага канкрэтнага свята. Затое у архівах Беларусі магчыма знайсці шматлікія справаздачы аб правядзенні адпаведных свят, дадзеныя аб удзельніках, сцэнарыях і дэкарацыях. Пэўная колькасць такіх справаздач стваралася мэтанакіравана, была прадугледжана праграмамі святкаванняў, публікавалася і несла адпаведную ідэалагічную нагрузку як у выпадку святкаванняў 50-годдзя ліквідацыі Брэсцкай царкоўнай уніі ў 1889 г., 100-гадовага юбілея вайны 1812 г. у 1912 г. і 300-годдзя панавання дынастыі Раманавых у 1913 г.

Большасць існуючых архіўных крыніц па афіцыйнай святочнай культуры можна даследаваць у Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ў г. Мінск (НГАБ у Мінску). Асабліва інфарматыўнымі ў гэтым сэнсе з'яўляюцца фонды канцылярый грамадзянскіх губернатараў: Віцебскага, ф. 1430, Мінскага, ф. 295, Магілёўскага, ф. 2001. Згаданыя фонды утрымліваюць інфармацыю аб правядзенні найбольш важных афіцыйных святаў, у якіх прымалі непасрэдны ўдзел губернскія улады. Акрамя інфармацыі пра арганізацыю і і ажыццяўленне святочных мерапрыемстваў, гэтыя фонды захоўваюць дакументы пра ўвекавечванне памяці святочных падзей і іх знакавых юбілеяў, гістарычных асоб: дзяржаўных і рэлігійных дзеячаў, военачальнікаў, пісьменнікаў і паэтаў і інш. [6, 8, 13, 16, 18, 21, 22, 24, 25].

Вялікую колькасць дакументаў пра непасрэдную рэалізацыю афіцыйнай святочнай культуры утрымліваюць фонды навучальных устаноў: вучылішч, гімназій, настаўніцкіх семінарый, кадэцкіх карпусоў і інш [15]. Цэлы пласт святочнай культуры існаваў толькі для навучэнцаў і функцыянаваў выключна у іх асяроддзі. У першую чаргу гэта тычыцца святкавання у другой палове XIX - пачатку XX ст. шматлікіх юбілеяў і гадавін расійскіх пісьменнікаў і паэтаў: А.С. Пушкіна (1880, 1887, 1899), М.Ю. Лермантава (1891, 1911, 1914), М.С. Салтыкова-Шчадрына (1899), М.В. Гогаля (1902, 1909), В.А. Жукоўскага (1902), М.А. Някрасава (1903), Л.М. Талстога (1908) і інш. Узгаданыя святы з-за іх спецыфічнай аудыторыі некаторыя даследчыкі называюць "школьнымі" [3, с. 90].

Пэўныя звесткі пра святочную культуру у гарадах Беларусі ўтрымліваюць фонды губернскіх "предводителей дворянства" а таксама фонды гарадских дум и мясцовых земскіх устаноў. Шмат дакументаў адносна афіцыйных святаў у г. Мінск утрымліваюць фонды 22 і 24: "Минское губернское по земским и городским делам присутствие" і "Минская городская дума" [5, 7, 9, 10, 14, 19, 20]. Самыя значныя афіцыйныя ўрачыстыя мерапрыемствы і святы ўяўляецца магчымым прааналізаваць адразу па некалькіх а то і па некалькіх дзесятках крыніц. Некаторыя з гэтых дакументаў былі апублікаваны ў адпаведнай літаратуры, як, напрыклад, крыніцы па святкаванню ў 1912 г. 100 гадовага юбілею вайны 1812 г. [2].

Падобныя па характару гістарычныя звесткі аб святкаваннях другой паловы XIX - пачатку XX ст. могуць быць знойдзены ў НГАБ у г. Гродна. Як і ў выпадку з іншымі губерніямі, найбольшая колькасць інфармацыі пра афіцыйныя святы захоўваецца ў фондзе канцэлярыі мясцовага (Гродзенскага) губернатара, фонд 1,а таксама ў фондзе 2 "Гродненское губернское правление Министерства внутренних дел". Разам з дакументамі якія утрымліваюць інфармацыю пра святкаванне юбілеяў 900-годдзя хрышчэння Русі ў 1888 г., 50-годдзя адмены прыгоннага права ў 1911 г. а таксама юбілеяў 1912 і 1913 гг. у гродзенскім архіве адзінкава сустракаюцца унікальныя па інфарматыўнасці дакументы. Да ліку апошніх варта аднесці справу за 1900 г. аб агранізацыі ў Гродна свята пасадкі дрэваў. Згаданае свята ўпершыню ў Расійскай імперыі было

Рэпазіторый ВДУ

святкавана ў 1898 г. у Харкаве, а прамым прататыпам да яго стварэння было запазычанае са Злучаных штатаў Амерыкі свята "Arborday"[17].

Аднак найбольш падрабязнае уяўленне аб гісторыі афіцыйных урачыстасцяў даюць крыніцы публіцыстычнага характару. Вялікай увагай тагачасных СМІ карысталіся святы з нагоды прыезду значных асоб: свецкіх і духоўных іерархаў, наведванне якімі пэўнага населенага пункту з'яўлялася святам для яго жыхароў. Часам святы арганізоўваліся з нагоды юбілеяў і гадавін жыцця, смерці і дзейнасці такіх асоб. У прыватнасці прэсай асвятляліся святочныя мерапрыемствы звязаныя з асобамі І. Сямашкі, Г. Каніскага, А. Суворава, М. Мураўёва і інш. Дастаткова разгорнута святочныя мерапрыемствы асвятляліся ў неафіцыйным аддзеле епархіальных ведамасцяў кожнай губерніі. Падрабязна апісаныя былі святкаванні 1885 г. з нагоды 1000-годдзя са дня смерці св. Мефодзія ("День славянской письменности", "Кирилло-Мефодиево торжество"), 900-гадовы юбілей прыняцця хрысціянства на Русі ў 1888 г., 50-гадовы юбілей ліквідацыі уніяцкай царквы ў 1899 г. і інш. Вялікая увага надавалася таксама святам, звязаным з культамі праваслаўных святых: Сергія Раданежскага, Ефрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Афанасія Філіповіча [1, 11, 12, 27].

Губернскія і епархіальныя ведамасцібеларускіх губерняў падрабязна і дакладна фіксавалі амаль кожнае афіцыйнае свята. Абсалютная большасць такіх крыніц мае апісальны характар, дзякуючы чаму ў гісторыкаў захавалася магчымасць прааналізаваць сцэнарыі святкаванняў, дэкарацыі асобных свят, уплыў святочнай культуры на насельніцтва беларускіх гарадоў. У сувязі з тым што ў згаданы перыяд афіцыйная святочная культура выконвала ідэалагічную функцыю, шэраг свят фіксаваўся ў прэссе у абавязковым парадку. Пасля некаторых святаў паўставалі адпаведныя зборнікі публіцыстычных матэрыялаў з апісаннем святкаанняў у розных гарадах і рэгіёнах імперыі [23, 26].

У згаданых публіцыстычных крыніцах магчыма знайсці нешматлікія фатаздымкі на якіх адлюстраваны элементы свята: парады і крыжовыя хады, дэкарацыі, удзельнікі свята і вынікі святочнай мемарыялізацыі: шэраг манументальных і рэлігійных помнікаў, адукацыйных устаноў, пераіменаваных вуліц, гарадскіх раёнаў і інш. Узгадкі пра фатографаў у святочных працэсіях і зробленыя фотаздымкі святаў фіксуюцца пачынаючы з 1860-1870 гг., аднакна жаль да сённяшняга дня гэты значны аб'ём ілюстратыўнай інфармацыі не падлягаў практычна ніякім упарадкаваннем і сістэматызацыі. Разам з фатаздымкамі на пачатку ХХ ст. святочныя (і не толькі) мерапрыемствыпачалі фіксавацца на відэа. У апошнія дзесяцігоддзі існавання імперыі быў назапашаны значны відэаматэрыял з розных афіцыйных святаў у гарадах на прасторы усёй краіны, у тым ліку і беларускіх губернях. На відэа былі запісаны святочныя мерапрыемствы ў Мінску, Гродна, Полацку і інш.[4]. Негледзячы на тое што не ўсе дакументальныя звесткі захаваліся да нашага часу, увесь комплекс згаданых крыніц дазваляе скласці сістэмнае уяўленне пра функцыянаванне афіцыйнай каляндарнай сістэмы і месца афіцыйных святаў у тагачасным грамадска-палітычным, рэлігійным і культурным жыцці.


1. Альбицкий, В. По поводу исполнившейся 8-го июня 1889 г. 50-ти лет-ней годовщины по возсоединении униатов с православною церковию (Письмо в редакцию) / В. Альбицкий // Полоцкие епархиальные ведомости. – 1889. – № 23. – С. 1004–1007.
2. Беларусь и война 1812 года: Документы / сост. А. М. Лукашевич, Д. Л. Яцкевич; редкол.: В. И. Адамушко (гл. ред.). – 2-е изд. – Минск : Беларусь, 2013. – 559 с.
3. Вдовин, А. В. Годовщина смерти литератора как праздник: к истории традиции в России (1850–1900-е гг.) / А. В. Вдовин // Festkultur in der russischen Literatur (18. bis 21. Jahrhundert) / Культура праздника в русской литературе XVIII–XXI вв. / Hrsg. von A. Graf. München: UTZ Verl., 2010. – С. 81–93.
4. Вишневский, В. Е. Документальные фильмы дореволюционной России 1907–1916 / В. Е. Вишневский. – М. : Музей кино, 1996. – 285 с.
5. Дело о переносе юбилейного памятника с Захарьевской улицы на площадь между Московской и Захарьевской улицами в г. Минске // НГАБ. – Ф. 22. Оп. 1 Д. 124.
6. Дело о сборе пожертвований на сооружение памятника Ермолову А. П. в г. Орше // НГАБ. – Ф. 295. Оп. 1 Д. 8054.
7. Дело о сборе средств на сооружение памятника Адаму Мицкевичу в г. Новогрудке // НГАБ. – Ф. 320. Оп. 1. Д. 374.
8. Дело о сооружении памятника Александру II в г. Мозырь // НГАБ. – Ф. 295. Оп. 1. Д. 8253.
9. Дело об открытии городской публичной библиотеки и музея им. А. С. Пушкина в г. Витебске в честь 100-летия со дня рождения поэта // НГАБ. – Ф. 2496. Оп. 1 Д. 306.




Репозиторий ВГУ

10. Доклад Витебской городской управы городской думе о переименовании одной из улиц в г. Витебске в Суворовскую в честь 100-летия со дня смерти Суворова // НГАБ. – Ф. 2496. Оп. 1 Д. 607.
11. Дубровский, М. Житие преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой: К торжеству перенесения святых мощей пресвятой Евфросинии из г. Киева в г. Полоцк / Михаил Дубровский. – Санкт-Петербург : Полоц. церк. братство во имя св. Николая и преподобной Евфросинии, княжны Полоцкой, 1910. – 19 с.
12. К столетию со дня рождения блаженной памяти митрополита Иосифа Семашко // Минские епархиальные ведомости. – 1898. – № 24. – С. 731–734.
13. О выработке программы 100-летия Отечественной войны // НГАБ. – Ф. 1430. Оп. 1 Д. 48430.
14. О подписке на сооружение в г. Минске часовни в память спасения жизни государя императора 4 апреля 1866 г. // Национальный исторический архив Беларуси (НГАБ). – Ф. 320. Оп. 2 Д. 95.
15. О присвоении Полоцкой учительской семинарии имени Кульневской в память героя Отечественной войны 1812 г. генерала Кульнева // НГАБ. – Ф. 2566. Оп. 1 Д. 818.
16. Об огранизации празднования 100-летнего юбилея Отечественной войны // НГАБ. – Ф. 2001. Оп. 1 Д. 2081.
17. Об организации праздника древонасаждения в губернии // НГАБ у г. Гродна. – Ф. 1. Оп. 9 Д. 1335.
18. Переписка с начальником полиции Минской губернии, минским полицмейстером и уездными исправниками о проведении чествования 100-летнего юбилея украинского поэта Шевченко Т.Г. // НГАБ. – Ф. 295. Оп. 1 Д. 8622 (б).
19. Постановление думы о сооружении памятника Александру II в сквере напротив здания присутственных мест // НГАБ. – Ф. 24. Оп. 1 Д. 3600.
20. Постановление думы об отводе Минскому православному братству 100 кв. саженей городской земли на Юбилейной площади для постройки часовни в память избавления царя от опасности раскрытого заговора // НГАБ. – Ф. 22. Оп. 1 Д. 3629.
21. Постановления Новогрудской городской думы от 28 апреля 1883 г. об устройстве иллюминации и угощения и открытии в г. Новогрудке мужской гимназии под названием «Александро-Мариинская» в честь коронации императора // НГАБ. – Ф. 295. Оп. 1 Д. 3828.
22. Рапорты исправников и полицмейстеров о спокойном настроении польского населения в связи с 50-летием со дня восстания 1863 г. и др. // НГАБ. – Ф. 1430. Оп. 1 Д. 49042.
23. Торжество 50-летия воссоединения униатов с православной церковью: 8-е июня 1889 г. в Вильне и др. местах Западной России. – Вильна : Губ. тип., 1889. – 356 с.
24. Уведомление минского губернатора нач. штаба Минского военного округа о запрещении литературно-музыкального вечера в память польского писателя Г. Сенкевича // НГАБ. – Ф. 295. Оп. 1 Д. 9187.
25. Фотография с заголовком: открытие памятника «матери Полтавской баталии», сражения при д. Лесной 1708 г. (1912 ?) // НГАБ. – Ф. 2001. Оп. 1 Д. 2079.
26. Царствующий Дом Романовых. 1613–1913. – СПб. : т-во скоропечатни А. А. Левенсон, 1913. – 419 с.
27. Церковное торжество, имеющее быть 3 мая в г. Бресте. Св. Афанасий Филиппович, игумен Брестский. 1 мая 1649–1 мая 1909 года // Гродненские епархиальные ведомости. – 1909. – № 16. – С. 70–72.

**Никитина Н.П.**

## ВИТЕБСКАЯ ГУБЕРНИЯ В ВОСПОМИНАНИЯХ НЕПРЕМЕННОГО ЧЛЕНА ЗЕМЛЕУСТРОИТЕЛЬНОЙ КОМИССИИ НЕВЕЛЬСКОГО УЕЗДА Г.М. САДОВСКОГО

Современная историческая парадигма все чаще обращается к внутреннему миру человека и как следствие источники личного происхождения начинают занимать в этом особое место. Публикация данного вида источников в последние годы набирает оборот. Стоит выделить серию книг Всероссийской мемуарной библиотеки, основанной А.И. Солженицыным. Первый выпуск увидел свет в 1997 г. Основатель рассматривал данный проект как способ сохранения связи с прошлым. Одна из серий этого издания посвящена российской и советской деревни первой половины XX в. В сборник вошли воспоминания бывшего непременного члена землеустроительной комиссии Невельского уезда Витебской губернии Георгия Митрофановича Садовского. Автором комментариев к тексту является Н.Ф. Гриценко.

Воспоминания Г.М. Садовского хотя и введены в научный оборот, но не получили еще достаточно глубокого анализа [6]. Данный источник личного происхождения интересен не только с точки зрения модернизационных процессов, происходивших в провинции в условиях реализации Столыпинской реформы, но и в контексте изучения повседневности.

Информация о Г.М. Садовском в комментариях скудна: «родился в Латвии, выпускник Московского университета…В годы Первой мировой войны – председатель Витебской губернской комиссии по приему лошадей для армии. В 1917 г. Был назначен витебским районным агрономом…эмигрировал; жил в Латинской Америке» [4, с. 447]. Однако из теста воспоминаний следует,



Репозиторий ВГУ